**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ**
**КАРЭЛІЦКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

***Праводзяць***
**XIV Карэліцкія краязнаўчыя чытанні:**

# «ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА КАРЭЛІЧЧЫНЫ»

**Плануемае поле канферэнцыі:**

- Карэлічы і ваколіца паводле археалагічных крыніц;
- развіццё Карэліччыны ў часы Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай;
- Карэлічы ў XIX – XX стагоддзях;
- Карэліччына ў віхурах войн і рэвалюцый, пасляваеннае адраджэнне і развіццё;
- культурная спадчына Карэліччыны (архітэктура, мастацтва, асвета, літаратура, этнаграфія і інш.);
- сацыяльная прастора Карэліччыны (сацыяльныя і маёмасныя группы, іх узаемаадносіны, роля ў гісторыі краю);
- сельская гаспадарка, рамяство, гандаль, вытворчасць, шляхі зносін у гісторыі краю;
- славутыя імёны Карэліччыны.

Час правядзення канферэнцыі **12 лістапада 2021 г.**

Плануемае месца правядзення канферэнцыі **г.п. Карэлічы Гродзенскай вобл.**

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца да **6 кастрычніка 2021 г.**

У заяўцы паведамляецца імя, імя па бацьку і прозвішча дакладчыка, яго навуковая ступень і званне, назва даклада, назва ўстановы, якую прадстаўляе дакладчык, кантактны тэлефон, e-mail.

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для выступлення і публікацыі. Пацвярджэнне аб удзеле ў канферэнцыі будзе даслана да **12 кастрычніка 2021 г.**

Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваны. Патрабаванні да тэкстаў: аб’ём – не болей 40 000 знакаў, спасылкі пастаронкавыя, нумарацыя спасылак на кожнай старонцы. Першая спасылка на публікацыю даецца цалкам (аўтар, назва, месца і год выдання, старонкі), у наступнай спасылцы месца і год выдання не падаюцца. Тэксты прадстаўляюцца ў аргкамітэт па электроннай пошце *dounar_zagor@mail.ru* да **12 снежня 2021 г.**

**Рабочыя мовы канферэнцыі:** беларуская, руская, польская. Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца па электроннай пошце: dounar_zagor@ mail.ru

*Кантакты*: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Тэл. (017) 284-14-09, факс (017) 284-18-70. Доўнар Аляксандр Барысавіч, e-mail: dounar_zagor@ mail.ru.

Харчаванне аплочваецца арганізатарамі канферэнцыі, праезд па маршруце Мінск – Карэлічы – Мінск ажыццяўляецца арганізатарамі канферэнцыі.

**Аргкамітэт канферэнцыі**